**Т. М. Зямлянік,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі
СШ № 2 г. Турова

# У ПОШУКАХ ШЧАСЦЯ І БУДУЧЫНІ: ШЛЯХІ ГЕРОЯЎ К.ЧОРНАГА

МЭТА: даследаваць разуменне сэнсу жыцця героямі рамана, вызначыць іх погляд на будучыню; адлюстраваць аўтарскую канцэпцыю ідэальнага чалавечага жыцця; развіваць мысленне вучняў, іх вуснае маўленне; уменні і навыкі крытычнага аналізу твора; фарміраваць эмацыянальна-якасныя адносіны да жыцця праз успрыманне мастацкага твора; выхоўваць любоў і павагу да мастацкага слова; свядомае стаўленне да жыцця, адказнасць за свае ўчынкі.

АБСТАЛЯВАННЕ: партрэт К.Чорнага, выстава малюнкаў вучняў да твора.

ЭПІГРАФЫ:
Гэта быў жудасны час, калі кавалак хлеба і палатняная рубашка – адна на год – здавалася шчасцем. І тым не менш, бацькі мае цьмяна марылі аб нейкай невядомай ім лепшай долі для сваіх дзяцей.

Як свет стаіць, то яшчэ не было вядома, каб на нянавісці вырасла шчасце, а радасць – на чужой бядзе.

Добрая тая кніга, калі яна ўзбівае чалавека на сталыя і важныя думкі.

К.Чорны.

ХОД УРОКА

1. Арганізацыйны момант.
2. Уступнае слова настаўніка.

Сёння ў нас апошні ўрок па вывучэнні рамана К.Чорнага “Пошукі будучыні”. На папярэдніх занятках мы з вамі вызначылі сюжэтна-кампазіцыйныя асновы твора, адзначылі майстэрства Чорнага-псіхолага ў раскрыцці характараў галоўных герояў твора.

А сёння я прапаную вам звярнуцца да загалоўка рамана “Пошукі будучыні”.

- Як вы думаеце, што падразумеваў аўтар пад словам “будучыня”?

Праводзіцца “мазгавы штурм” – работа са словам “будучыня”.

На дошцы запісваюцца ўсе варыянты адказаў. Потым выдзяляецца слова, якое, на думку вучняў, найбольш ёмка адлюстроўвае паняцце.

- Ці можна паміж гэтымі словамі паставіць знак роўнасці, тоеснасці? Чаму?

Усе без выключэння героі рамана так ці інакш знаходзяцца ў дарозе, у пошуку сваёй будучыні і будучыні сваіх дзяцей. Усе яны мараць аб шчасці. Але жыццё іх праходзіць па-рознаму, і шляхі, якімі яны ідуць да сваёй мэты, адрозніваюцца. Таму мэта нашага сённяшнягя ўрока – даследаваць, што ёсць

жыццё для кожнага з  герояў рамана, вызначыць шляхі, якімі яны ідуць да шчасця, апісаць іх погляд на будучыню. На аснове атрыманых ведаў ахарактарызаваць аўтарскую канцэпцыю ідэальнага чалавечага жыцця.

3. Праверка дамашняга задання.

Клас падзелены на групы. Кожная група атрымала заданне: запісаць у "двухбаковы дзённік" цытаты-разважанні аб шчасці і будучыні таго ці іншага героя. Абмяркуйце свае запісы ў групах і выберыце па адным-два, якія найбольш ярка выяўляюць светапогляд свайго аўтара. Адзін з вучняў выступае з адказам.

4. Вывучэнне новага матэрыялу.

На папярэдніх уроках мы ўмоўна падзялілі герояў твора на групы паводле іх сямейных стасункаў, адносін да жыцця. Сёння ваша задача – вызначыць, у чым яны бачаць сваю будучыню, якія жыццёвая каштоўнасці лічаць самымі важнымі.

Вы можаце выкарыстаць свае запісы-цытаты, эпіграфы, лісты з пытаннямі, якія накіруюць вас на  правільны шлях.

Вучні працуюць у групах.

Перад адказам адзін з удзельнікаў групы (вучань з нізкай паспяховасцю) выбірае эпіграф (з ліку запісаных на дошцы), які б адпавядаў сутнасці героя, аб якім пойдзе гаворка.

Раман "Пошукі будучыні" быў напісаны падчас вайны. Адзнака пражытага болю за Бацькаўшчыну, за гаротны лёс людзей ляжыць на усім творы. Кузьма Чорны імкнуўся зазірнуць у заўтрашні дзень, таму што па-мастакоўску адчуваў рух часу, вялікія змены ў жыцці, непазбежныя пасля ўзрушэнняў ваеннага ліхалецця. Ён нібы пракладваў шляхі ў будучыню, правяраючы лёсамі герояў і абставінамі вайны каштоўнасці мінулага дня. І многія з іх не вытрымлівалі гэтай праверкі. Затое высвятляліся сапраўдныя каштоўнасці. Які ж ён, ідэал чалавечага жыцця? Якім бачыць яго КузьмаЧорны?

Адказаць на гэта пытанне нам дапаможа метад "Карусель" .

Пытанні, якія разглядаюцца на гэтым этапе ўрока:

- Як праз мэты, якія чалавек ставіць перад сабой, выяўляецца сутнасць яго асобы?
- Якая аўтарская задума ўвасобілася ў супастаўленні лёсаў Нявады-Лукашэвічаў-Ракуцькаў і Паліводскага-Акаловіча-Шрэдэраў?
- Якія каштоўнасці К.Чорны лічыць самымі галоўнымі? У якім вобразе гэтыя рысы ўвасоблены?
- Якой вы бачыце канцэпцыю жыцця і асобы, яе лёсаў на жыццёвых пуцявінах у творы К.Чорнага " Пошукі будучыні"?
- К.Чорны сцвярджаў: "Чалавек – гэта цэлы свет". Які сэнс пісьменнік укладваў у гэты выраз?

Праводзіцца абагульненне адказаў.

Свет трымаецца любоўю і дабрынёй, а злыя разбуральныя сілы імкнуцца задушыць чалавечае ў чалавеку. Яны змусілі Шрэдэра-старэйшага шкадаваць

аб сваім высакародным учынку, змарнавалі маладосць і жыццё Люцыяна Акаловіча, графа Паліводскага.

Пісьменнік перакананы, што чалавек не можа замыкацца на сваім уласным “Я”. Ён не можа абысціся без людзей, тых, хто дапамагае яму, за каго ён адчувае адказнасць. Дабро павінна нараджаць дабро. Калі такога не здараецца, чалавек траціць сябе як чалавека, спусташае ўласную душу.

Кузьма Чорны глядзіць на жыццё як на бесперапынны працэс тварэння чалавекам сваёй будучыні і будучыні наступных пакаленняў. Пісьменнік сцвярджае, што будучыня чалавецтва залежыць ад саміх людзей, ад іх жадання быць людзьмі.

А цяпер звернемся да эпіграфа, які запісаны на дошцы. (Хтосьці з вучняў чытае эпіграф.) Аб чым прымусіў задумацца вас твор К.Чорнага?

Раман невыпадкова называецца “Пошукі будучыні”. Ён ёсць адказ на пытанне, якое хвалявала пісьменніка здаўна: “Куды мы ідзём? Ці ёсць у нас і нашых нашчадкаў будучыня?”

У сувязі з гэтым я прапаную вам паслухаць урывак з настаўленняў А.Даллеса, былога шэфа ЦРУ, якія ён прадстаўляў вярхоўным эшалонам улады яшчэ ў 1945 годзе:

“ Чалавечы мозг, свядомасць людзей здольныя да змянення. Пасеяўшы там хаос, мы непрыкметна падменім іхнія каштоўнасці на фальшывыя і прымусім іх у гэтыя фальшывыя каштоўнасці верыць. Як? Мы знойдзем сваіх аднадумцаў у самой Расіі.

Эпізод за эпізодам будзе разыгрывацца грандыёзная па сваім маштабе трагедыя пагібелі самага непакорнага на зямлі народа, незваротнага выніковага згасання яго самасвядомасці.

З літаратуры і мастацтва, напрыклад, мы паступова вытравім іх сацыял ьную значымасць. Літаратура, тэатр, кіно – усё будзе адлюстроўваць і праслаўляць самыя нізкія чалавечыя пачуцці. Мы будзем усяляк падтрымліваць так званых мастакоў, якія будуць насаджаць культ сэксу, гвалту, садызму, здрадніцтва – адным словам , усялякай амаральнасці.

Мы будзем незаўважна, але актыўна і пастаянна спрыяць самадурству чыноўнікаў, хабарнікаў. Сумленнасць і прыстойнасць будуць высмейвацца і будуць нікому непатрэбнымі, ператворацца ў перажытак мінулага. Хамства і нахабства, хлусня і падман, п’янства і наркаманія, жывёльны жах адно перад адным, здрадніцтва, нацыяналізм і варожасць паміж народамі – усё гэта мы будзем незаўважна і спрытна культываваць, усё гэта дасягне нечуваных памераў.

І толькі нямногія, вельмі нямногія будуць здагадвацца ці нават разумець, што адбываецца. Але такіх людзей мы паставім у бездапаможнае становішча, ператворым у пасмешышча, знойдзем спосаб абілгаць іх і аб’явіць адкідамі грамадства. Будзем вырываць духоўныя корні, апашляць і знішчаць асновы народнай маралі. Мы будзем аслабляць такім чынам пакаленне за пакаленнем. Будзем брацца за людзей з падлеткавага ўзросту, асноўную ўвагу скіруем на моладзь, будзем разлагаць, растляваць яе. Мы зробім з іх цынікаў, пашлякоў, касмапалітаў. Вось так мы гэта зробім!”

Калі вам гэтыя пачварныя словы, на здзяйсненне якіх было выдадзена каля пяці трыліёнаў долараў, пададуцца ўжо ўстарэлымі, я прапаную асэнсаваць нашу сучасную рэчаіснасць менавіта з пазіцый тых мэт, аб якіх гаварыў Даллес. Сёняшні дзень паказвае, што многія з нас ідуць па шляху найменшага супраціўлення, прымаюць чужыя ідэалы за свае, паддаюцца шкоднай прапагандзе. Таму і патрэбна нам чытаць і перачытваць класікаў, якія даўно далі адказы на ўсе хвалюючыя пытанні.

Ад вас, ад моладзі, залежыць наша будучыня. Якімі будзеце вы, такім будзе і наша жыццё.

5. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія

Як абагульненне ўсяго вышэй сказанага, я прапаную кожнай групе скласці сінквейн да слова "будучыня". А цяпер "дзелім пірог". Кожная група адзначае удзел кожнага ў агульнай працы.

6. Дамашняе заданне. Падрыхтавацца да кантрольнага сачынення па рамане К.Чорнага "Пошукі будучыні".

ЗАДАННІ ДЛЯ ГРУПЫ 1.

1. Чаму Волечка і іншыя ратуюць хворага палоннага немца? Якія каштоўнасныя арыенціры відавочныя ў паводзінах гэтых герояў?
2. Чаму Волечка і Кастусь неахайна адносяцца да золата? Што для іх важней за багацце?
3. Чаму Кастусь забівае Шрэдэра, калі раней ратаваў яго?
4. Які момант у жыцці Нявады можна лічыць самым шчаслівым? Чаму?
5. Чаму загінуў Нявада? У чым ён памыліўся?

ЗАДАННІ ДЛЯ ГРУПЫ 2.

1. Чаму на Першую сусветную вайну Шрэдэр-старэйшы ішоў з радасцю? Што прымусіла яго забыць страх за сваё жыццё, пра грэх забіраць жыццё іншых?
2. Чыму стары Шрэдэр аддаў золата Волечцы?
3. З якой прычыны ўсё жыццё сварацца Густаў і Гертруда? Як яны жылі? Чаму загінулі? Якую будучыню шукалі?
4. Чаму Шрэдэр-малодшы вырас фашыстам? Якую думку сцвярджае гэтым вобразам К.Чорны?

ЗАДАННІ ДЛЯ ГРУПЫ 3.

1. У чым вытокі драматычнага лёсу Сымона Ракуцькі?
2. Прыгадайце самы шчаслівы і самы нешчаслівы момант у жыцці С.Ракуцькі. З якімі падзеямі яны звязаны?
3. Да якой важнай высновы прыводзіць Сымона Ракуцьку ўласная трагедыя?

4. Якую думку сцвярджае К.Чорны вобразам гэтага персанажа?

ЗАДАННІ ДЛЯ ГРУПЫ 4

1. З чым звязвае сваю будучыню Л. Акаловіч? Які лёс ён сабе рыхтуе?
2. Якое жыццё пражыў Паліводскі? Чаму Нявада, пачуўшы гісторыю Паліводскага ад карчмара, шкадуе графа?
3. Якія каштоўнасці былі ў жыцці Акаловіча і Паліводскага найпершымі? Да якога яны прыйшлі фіналу? Ці заканамерны такі фінал? Чаму?
4. Якога кампаненту жыцця і звычайнага чалавечага лёсу не хапала ў абраных жыццёвых пуцявінах аднаго і другога?
5. Ці задумваліся гэтыя героі пра сродкі, якімі карысталіся для дасягнення сваіх мэт? Чаму?